УДК 392.86:612.393.1«18–19»(476)

# УСПРЫМАННЕ ГАРЭЛКІ Ў ТРАДЫЦЫЙНАЙ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ І ПРАЦЭС ЯЕ СПАЖЫВАННЯ (ПАВОДЛЕ ЭТНАГРАФІЧНЫХ КРЫНІЦ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.)

***Сяргей Мяньчэня***
*Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь*
men_sv@tut.by

У артыкуле разглядаюцца такія аспекты традыцый культуры Беларусі як праблема паходжання гарэлкі, традыцыі яе спажывання, яе месца ў народнай абраднасці.
***Ключавыя словы: гарэлка, спажыванне алкаголя, народныя прыкметы, народная абраднасць***

# THE PERCEPTION OF VODKA IN TRADITIONAL BELARUSIAN CULTURE AND THE PROCESS OF ITS CONSUMPTION (ACCORDING TO ETHNOGRAPHIC SOURCES OF THE 19TH – EARLY 20TH CENTURIES)

Siarhei Mianchenya
*Belarusian State Agrarian Technical University, Minsk, Belarus*

The article is devoted to such aspects of Belarusian cultural traditions as the problem of the origin of vodka, traditions of its consumption, its place in folk rituals.
***Key words: vodka, alcohol consumption, folk signs, folk rites***

Празмернае спажыванне алкаголя, як спадарожнік негаспадарлівасці і лайдацтва, а таксама прычына галечы, у беларускім грамадстве ўспрымалася негатыўна, аднак адносіны да гарэлкі і яе памеранага спажывання былі даволі неадназначныя.

М. Нікіфароўскі прыводзіць наступныя тэрміны, што ўжываліся для пазначэння гарэлкі ў народным асяроддзі: «вадзіца аржаная», «святая», «аржанушка», «пасніца», «весялушка», «гаркушка», «зыбярушка», «акаянніца» [1, с. 70]. Як бачна, усе яны, акрамя апошняга, негатыўнага адцення не маюць.

Паходжанне гарэлкі народная творчасць звязвала з чортам, што выяўляла яе грахоўны пачатак. Падобныя погляды сустракаюцца ў апавяданнях «Гарэлка» С. Палуяна і «Чортава зелле» М. Галкі, асновай якіх сталі народныя паданні.

У апавяданні «Гарэлка» гаспадар апынуўся ў складанай сітуацыі і падаўся ў лес, каб павесіцца, але па дарозе сустрэў невядомага паніча (чорта), які пазычыў яму грошы. Калі прыйшоў час расплаты, чорт сказаў, што грошы можна не аддаваць,  калі мужык заб’е чалавека, або «зманіць» дзяўчыну ці нап’ецца гарэлкі. Мужык звярнуўся за парадай да жонкі, якая адказала, што «чалавека забіць – страшэнны грэх, дзеўку зманіць – грэх і сорам перад суседзямі, гарэлкі напіцца – глупства», і сама дала яму грошы на гарэлку. Скончылася гісторыя трагічна – напіўшыся, мужык згвалціў суседскую дзяўчыну, а пасля забіў яе. Гарэлка, якая сама па сабе не лічылася грахом, стала пачаткам усіх астатніх [2, с. 412]. У апавяданні «Чортава зелле» сюжэт падобны, але прысутнічае і арыгінальнай тлумачэнне назвы напою.. Пасля таго, як мужык яго пакаштаваў «неяк троху запякло, зрабілася адразу цёпла, яшчэ сербануў, – і ў галаве бытцам усе калёсікі заварушыліся..

– Вот-як! – сказаў з дзіву чалавек.

– Але, водка, – падхапіў, добра не расслухаўшы чорт, – нехай завецца водкай» [2, с. 413].

Е. Раманаў прыводзіць некалькі казак, у якіх акрамя чортава аўтарства гарэлкі прыводзіцца і пазіцыя Бога ў дачыненні да яе. У першай з іх – «Гарэлка акаянная, але не праклятая» – Бог пасылае апосталаў Пятра і Паўла паглядзець, чаму над балотам шмат дыма. Першым выпраўляецца Павел і знаходзіць там чарцей, што гоняць гарэлку. Пакаштаваўшы чарку, ён не вяртаецца назад, а на яго пошукі выпраўляецца Пётр, але таксама застаецца. Бог, знайшоўшы апосталаў сярод чарцей, перахрысціў паднесеную яму чарку, але сам не выпіў: «калі ты маіх вярхоўных апосталаў звяла, дык не буду праклінаць табе, будзь ты акаянная, але не праклятая» [3, с. 11]. У казцы  «П’яны чалавек горш дурнога сабакі» таксама адзначаецца, што гарэлку прыдумаў чорт, а Бог паабяцаў чорту, што хто ад гарэлкі памрэ, будзе яго здабыткам. Сам Бог гарэлку не каштаваў, але дазволіў гэта зрабіць святым Міколе і Юр’ю, якім напой спадабаўся: «Гето хорошее дзело піць гето. Сколькі мы там яе выпілі, а ўдвайне ума прыбавілось. Гето можно піць нашаму народу!» [3, с. 13–14]. Аднак, сутыкнуўшыся з п’яным чалавекам, святыя мяняюць свой погляд.  Вынікае, што гарэлка мае права на існаванне, а ў чалавека маецца выбар – піць, ці не. Гэты выбар больш складаны за выбар паміж грахом і праведнасцю, бо калі і святыя п’юць, то што казаць пра простага чалавека.

Выразную антыалкагольную скіраванасць мае казка «Хвароба над хваробамі», апублікаваная А. Сержпутоўскім. Д’ябал адзначае поспехі п’янства ў павялічэнні смяротнасці, прызначае яго галоўнай хваробай – «хваробай над хваробамі» і дае пачэснае месца побач з сабой. Аднак у дадзеным выпадку асуджаецца менавіта п’янства, а не гарэлка, а сам сюжэт мог быць запазычаны з польскага часопіса «Kmjotek», што пазначае сам аўтар [4, с. 8–11]. А вось у казцы «Неба і пекла» галоўны герой вырашае застацца ў пекле: «аджэ гэто пекне, бо ўсё е: й цюцюн, и люлька, й гарэлка, а от песни и смех» [4, с. 2].

Людзей, што спажываюць гарэлку, можна падзяліць на дзве групы: «рытуальшчыкі» (п’юць рэдка, у сувязі з нейкай нагодай і нешмат) і «злаўжывальшчыкі» (п’юць рэгулярна і вялікімі дозамі). Сярод апошніх М. Нікіфароўскі выдзяліў «пітушчых», «запойцаў», «прапойцаў» і «падкарчомнікаў».

«Пітушчыя» – рэгулярна ўжывалі гарэлку ў кампаніі, часцей гэта былі людзі 30–40 гадоў, бо моладзь знаходзіла сабе іншыя варыянты баўлення часу, а у старых не было здароўя рэгулярна піць. Працэс спажывання суправаджаўся жартамі і спевамі, часам непрыстойнымі, негледзячы на наяўнасць у кампаніі жанчын. Збіраліся такія кампаніі звычайна на адкрытым паветры, пасля завяршэння мерапрыемства больш моцныя дапамагалі астатнім дайсці дадому.

«Запойцы» – перыядычныя алкаголікі, якія па-за перыядамі запоя маглі зусім не піць. Выпраўляючыся ў карчму, яны апраналіся ў святочнае, шчодра пліцілі карчмарам і частавалі іншых наведвальнікаў. Працягласць запоя залежыла ад плацежаздольнасці «запойцы» і ад аператыўнасці рэагавання на пачатак запоя яго сваякоў. Тым не менш часам здароўе запойцы не вытрымлівала, і запой прыводзіў да смерці. З увядзеннем дзяржаўнай «віннай» манаполіі ў 1897 г., што суправаджалася ліквідацыяй корчмаў і пераарыентацыяй рынку алкагольных напояў на вынасны гандаль, магчымасці працяглых запояў скараціліся.

«Прапойцы» – вясковыя алкаголікі, пілі рэгулярна, у адрозненні ад «пітушчых» у адзіноце, ці ў цесным коле. «Пітушчыя» да «прапойцаў» адносіліся з пагардай, у сваю кампанію не прымалі. У XIX ст. практыкаваліся пахаванні «прапойцаў», як і самагубцаў па-за межамі могілак. Калі «прапойца» цалкам прапіваў сваю гаспадарку, то пераўтвараўся ў «падкарчомніка» – алкаголіка-жабрака, у якога сваіх сродкаў на гарэлку не было. Асноўны час ён праводзіў каля карчмы, робячы розныя паслугі яе паведвальнікам ў надзеі атрымаць пачастунак [5, с. 162–172].

Працэс спажывання гарэлкі сярод «злаўжывальшчыкаў» пазначаўся наступнымі тэрмінамі: хапіць, перакінуць, забіць мушынку (для пазначэння малой ці вялікай папойкі), закінуць у шулумейку (шулумейка – галава), свіснуць, дзёрнуць, дзербалызнуць, скываць шыла. Пілі адразу з бутэлькі, непадалёк ад месца продажу, што асабліва пашырылася ў канцы XIX ст. У хатніх умовах гарэлку пералівалі ў спецыяльную пасудзіну, з якой па чарзе чарпалі спецыяльным коўшыкам ці чаркай [1, с. 70]. Як бачна, і ў першым, і ў другім выпадку калектыўнае адначасовае спажыванне не практыкавалася. Чарку гасцям перадаваў гаспадар, часам гасцей жаночага полу частавала гаспадыня [6, с. 39]. Чарговасць піцця магла парушацца ў некалькіх выпадках. Калі хто не спажываўгарэлкі, то павінны быў прыняць чарку і са словамі «будзьце здаровенькі ўсі» прыгубіць. Пасля чаго ён вяртаў чарка да наліваючага, які яе абнаўляў, ці перадаваў каму-небудзь з старэйшых і паважаных гасцей ці членаў сям’і, якія выпівалі яе па-за чаргой. Часам практыкавалася «узапарнае» спажыванне – дзве чаркі запар. Пры гэтым перад першай чалавек хрысціўся, а другую піў пасля «прымусаў» – гаспадар угаворваў, а госць павінны быў адмаўляцца [1, с. 71–72].

Класічная чарка мела аб’ём у палову «соткі» (1/100 вядра = 120 г), што складала 60 г. Чарка магла быць шкляной, парцэлянавай, глінянай, металічнай ці драўлянай. У апошнім варыянце мела форму коўшыка. Негледзячы не матэрыял чаркі пры спажыванні яе часта называлі «срэбранай». Сінонімамі слова «чарка» з’яўляліся «кручок, кіёк, пыпірашка». Гэтыя назвы ўжываліся таксама для пазначэння дарожнага кія, таксама вядомага як «пасашок» [1, с. 93]. З новай чаркі ў хаце трэба было піць так, каб не заставалася і кроплі гарэлкі, бо інačай госці будуць піць толькі пасля доўгіх «прымусаў». Прымаць чарку трэба было той жа рукой, якой яна падавалася. Каб пазбегнуць чараў, у чарку апускалі мізінец і такім чынам хрысцілі гарэлку, калі чарка былі зачараваная – яна трэскалася [7, с. 65–66, 91].

Пілі гарэлку «са смакывкой» – глыткамі, закінуўшы галаву ўверх, пакуль чарка, ці бутэлька не стане вертыкальна і не выльецца апошняя кропля. Пасля апошняй кроплі адбывалася «зморшванне», якое суправаджалася фразай «як гэта п’яніцы п’юць ды не моршчацца» [1, с. 71–72]. Галоўная задача гарэлкі была выклікаць «тлум» у галаве. Для большага эфекта ў гарэлку дадавалі перачны ці калганавы настой, а вось гарэлкі з мяккім і салодкім смакам стаялі рангам ніжэй. З увядзеннем манаполіі новая гарэлка (рэктыфікаваная, без дадаткаў) была ўспрынята па-рознаму. З аднаго боку, яна і «идёт лепше», і «горло не дереть», а з другога – «в голову не даеть» [8, с. 29].

Гарэлка прысутнічала ў народнай абраднасці як элемент пэўнага рытуала. У даным выпадку мэтай было само спажыванне, а не дасягненне эфекта ап’янення, а негатыўную рэакцыю грамадства магло выклікаць парушэнне традыцыі.

А. Пшчолка ў апавяданні «Деды» пазначаў, што для сялян спажыванне гарэлкі па святах – гэта неабходнасць: «без горелки, известное дело, дедов не справить» [9, с. 4]. Спроба галоўнага героя – Мікіты Пяруна – адмовіцца ад куплі гарэлкі выклікае здзіўленне і ціхае абурэнне аднавяскоўцаў. З пачаткам святочнай вячэры, пасля каштавання куцці, гаспадар, павярнуўшыся да вакна, бярэ бутэльку, налівае чарку і кажа: «Няхай же со святыми отпочиваютъ!». Пасля чарка пераходзіць да астатніх членаў сям'і, у тым ліку дзяцей, нават немаўляці даюць некалькі кропляў «для здароўя». Супраць гэтага выказваецца бацька малога – малодшы сын Мікіты, які

часта ездзіць у горад і выступае сваеасаблівым парушальнікам старых традыцый, але пратэст гэты губляецца ў агульнай пазіцыі астатніх членаў сям'і [9, с. 19]. У Слонімскім павеце на Дзяды першую чарку гарэлкі вылівалі на стол. Пад час спраўлення на могілках трызны, рэшткі гарэлкі вылівалі на магілы [10, с. 37, 41].

Ужывалася гарэлка і ў пачатку пастоў. Першы панядзелак Вялікага паста меў назву «шыльны» [1, с. 70] ці «паласказуб» [10, с. 36]. Гарэлку пілі, каб пазбавіцца ад рэштках мясной ежы. На Віцебшчыне «паласканне» праводзілася абавязкова пад адкрытым небам, удзельнічалі ў ім і мужчыны і жанчыны. Жанчыны, каб атрымаць ураджай ільна, павінны былі піць на яравым полі [7, с. 240]. У Гродзенскай губерні працэс часам паўтараўся ў аўторак [10, с. 37]. Лічылася, што «паласканне горла» патрэбна было, каб не зарадзіліся чэрві ў роце і жываце [7, с. 240]. Гэта мела пад сабой цалкам лагічнае тлумачэнне, бо такім чынам адбывалася банальная дызінфекцыя. Пілі гарэлку і на пачатку іншых пастоў. У першы дзень Пятрова паста на Віцебшчыне спраўлялі «брыксы» – пілі гарэлку, каб каровы былі дойнымі [6, с. 229].

Значная колькасць прыкмет, у якіх прысутнічае гарэлка, звязана з вясельнай абраднасцю. Гарэлка з’яўлялася неад’емнай часткай працэса сватання. Першым этапам яго былі «запоіны». У розных рэгіёнах яны мелі свае асаблівасці. У Быхаўскім павеце сваты прыносілі кварту гарэлкі і ставілі яе на акно, калі не атрымлівалі згоды – гарэлка заставалася, а сваты прыходзілі на другі дзень. Калі ж згода была атрымана – пілі, а затым клікалі сваякоў маладой. У залежнасці ад фінансавага стану маладога на «запоіны» ставілі ад гарнеца (2,82 л) да вядра гарэлкі (12,3 л), сваякі маладой забяспечвалі закуску. На наступны дзень сваты прыходзілі апахмяляцца [6, с. 486]. У Барысаўскім і Брэсцкім паветах «запоіны» праходзілі ў два этапа «першая ці малая гарэлка», і «вялікая гарэлка» (праходзіла ў прысутнасці жаніха) [11, с. 15, 19]. У Пружанскім павеце  калі дзяўчына навала згоду сватам, то казала бацькам піць гарэлку, што яны прынеслі, калі згоды не было – гарэлку не чапалі [10, с. 172]. У Віцебскім павеце пад час «запоінаў»  маладая сыпала ў гарэлку некалькі зерняў жыта, каб быў багаты ўраджай у яе будучай гаспадарцы і ў гаспадарцы сватоў. Аднак гарэлка магла несці і негатыўную энэргію – у выпадку асабістай адмовы дзяўчыны сватам, яны лілі на дзвярныя петлі некалькі кропель, каб яна ніколі не выйшла замуж [7, с. 55]. Тут таксама існаваў звычай «закармліваць маладуху» – перад вяселлем сват яшчэ раз наведваўся да бацькоў маладой з мясам і гарэлкай [6, с. 375]. У паўночнай Чарнігаўшчыне сярод сялян-літвінаў напярэдадні вяселля ў хаце маладой адзначаліся «дзявічкі», пры гэтым маладую з сяброўкамі адсылалі ў хату суседа, бо старэйшыя «залазілі за стол на бяседу» і пілі гарэлку. Дзеўкам перадавалі частку ежы і бутэльку, яны павінны былі сімвалічна пачаставацца [12, с. 237].

У Азярышчанскай воласці Гарадоцкага павету пад час вяселля маладая павінна была прыняць ад свёкра чарку гарэлкі, у якую клалі манету. Гарэлку яна выпівала, а грошы забірала сабе [6, с. 407]. Міншчыне падобныя маніпуляцыі праводзілі цешча і зяць – цешча выпівала за зяця, потым падала яму чарку, аднак той двойчы выліваў гарэлку на зямлю, а на трэці раз клаў у чарку манету і перадаваў цешчы [11, с. 57]. У Гарадокскім павеце госці пад час вяселля «напівалі гаспадарку маладым». Прымаючы чарку госць, напрыклад, казаў: «П’ю за авечку», і павінны быў падарыць яе маладым. Калі такіх падарункаў госці дазволіць сабе не маглі, то перадавалі грошы, сват лічыў іх і абвяшчаў, калі напівалі на тую ці іншую [6, с. 391]. Асобны рытуал існаваў для музыкаў. На Лепельшчыне цымбалісту налівалі першую чарку, бо цымбалы перасохлі, затым другую, бо падмочаныя не так скрыпяць [13, с. 190–191].

З гарэлкай была звязана і частка прыкмет, што датычылася вядзення гаспадаркі і будучага ўраджаю. Так, на Каляды забаранялася купляць гарэлку на грошы, што былі атрыманы ад продажу хлеба, бо іначай не будзе ўраджая. З гэтай прычыны гаспадары часта пазычалі грошы ў суседзей. Невядома, аднак, ці распаўсюджваліся негатыўныя наступствы на суседзкі ўраджай. Калі адзначалі пакупку каня, то ў чарцы пакідалі некалькі кропляў, якія затым вылівалі, падкідваючы чарку ўгору, каб конь быў здаровы і «падскокваў» . Каб атрымаць добры ўраджай ільна жанчыны пад час выкупа маладой павінны былі піць болей за мужчын [7, с. 64, 115, 222].

У народнай культуры XIX – пачатку XX ст. гарэлка, негледзячы на свой грахоўны пачатак, паўставала не толькі як сродак ап'янення, бо часта яе спажыванне не было самамэтай. Гарэлка з'яўлялася часткай святочнай і сямейнай абраднасці, камунікатыўнага працэсу. У гэтых выпадках яе спажыванне лічылася нормай, а асуджалася часцей адмова ад яго. Разам з тым мелі месца і негатыўныя з'явы. Побач з «рытуальным» спажываннем шырылася і пабытовае п'янства, якое суправаджалася пагаршэннем эканамічнага палажэння сялянскіх гаспадарак. Празмернае спажыванне лічылася, безумоўна, адмоўнай з’явай, аднак цалкам адмовіцца ад гарэлкі – «шклянога бога» [13, с. 73] – для сялян было складана.


1. Никифоровский, Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности. Этнографические данные / Н. Я. Никифоровский. – Витебск : Губернская типография, 1895. – 548 с.
2. Меньченя, С. В. Культура потребления алкогольных напитков и восприятие идеи трезвости в белорусских губерниях в условиях «винной» монополии и «принудительной трезвости» (1897–1917) / С. В. Меньченя. //«Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы. Исследования по Новой и Новейшей истории: сб. науч. ст. / отв. ред. С. Ф.Шимукович. – СПб.: Алетейя, 2022. – С. 406–425.
3. Романов, Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 4 : Сказки космогонические и культурные / Е. Р. Романов. — Витебск : Типо-литография Г. А. Малкина, 1891. — 220 с.
4. Сержпутовский, А. К. Сказки и разсказы белоруссов-полешуков (материалы к изучению творчества белоруссов и их говора) / А. К. Сержпутовский. – С.-Петербург : Типо-литография К. Л. Пентковского, 1911. – 188 с.
5. Никифоровский, Н. Я. Очерки Витебской Белоруссии / Н. Я. Никифоровский ; автор предисл. и сост. А. П. Ващенко. – Минск : Беларусь, 2019. – 271 с.

6. Романов, Е. Р. Быт белорусса. Словарь условных языков // Белорусский сборник. Выпуски восьмой и девятый. – Вильна: Типография А. Г. Сыркина, 1912. – 600, 126 с.
7. Никифоровский, Н. Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах местах ... Витебской Белоруссии. — Витебск : Губернская Типолитография, 1897. — 307 с.
8. Пщёлко, А. Р. Очерки и рассказы из жизни белорусской деревни / А. Р. Пщёлко. – Сборник 2-й. – Витебск : Типолитография наследников М. Б. Неймана, 1910.
9. П-ко, А. Деды (этнографический очерк из жизни Лепельских белорусов) / А. П-ко. – Витебск : Губернская Типолитография, 1898. – 23 с.
10. Материалы по этнографии Гродненской губернии.Выпуск 1. По поручению Виленского учебного округа редактировал Е. Романов. Издание Управления Виленского учебного округа, – Вильно : 1911. – 238 с.
11. Крачковский, Ю. Ф. Быт западнорусского селянина / Ю. Ф. Крачковский. – М. : Университетская типография. – 1874. – 212 с.
12. Косич, М. Н. Литвины-белорусы Черниговской губернии, их быт и песни / М. Н. Косич. – СПб : тип. кн. В.П. Мещерского, 1902. – [2], 128, 23 с.; 25.
13. Пщёлко, А. Р. Очерки и рассказы из жизни белорусской деревни / А. Р. Пщёлко. – Вильно : Типография «Русский почин», 1906. – 248 с.

УДК 37(476)(091)“15”

# АФАРМЛЕННЕ ЗЫХОДНЫХ ПРЫНЦЫПАЎ АДУКАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЕЗУІЦКАГА ОРДЭНУ Ў 1550-я ГАДЫ

***Андрэй Самусік***
*Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь*
a.f.samusik@gmail.com

У навуковым артыкуле ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі разгледжаны першапачатковыя захады езуітаў па выпрацоўцы агульных падыходаў да арганізацыі адукацыйнай справы. Адзначана адпаведная дзейнасць рэктара калегіўмаў у Месіне і Рыме І. Надаля. Падрабязна вывучаны “Канстытуцыі езуіцкага ордэну” 1558 г., IV частка якіх была цалкам прысвечана пытанням функцыянавання навучальных устаноў ордэна.
***Ключавыя словы: адукацыя, “хрысціянскі гуманізм”, езуіты, І. Лайёла, І. Надаль, “Канстытуцыі езуіцкага ордэну” 1558 г.***

# THE FORMATION OF THE BASIC PRINCIPLES OF THE EDUCATIONAL ACTIVITY OF THE JESUIT ORDER IN THE 1550s

***Andrej Samusik***
*Belarus State Economic University, Minsk, Belarus*

In the scientific article, for the first time in national historiography, the initial steps of the Jesuits to develop general approaches to the organization of educational affairs were considered. The relevant activity of the rector of collegiums in Messina and Rome, I. Nadal, was noted. The "Constitution of the Jesuit Order" of 1558 was studied in detail, the IV part of which was fully devoted to the functioning of the order's educational institutions.
***Keywords: education, "Christian humanism", Jesuits, I. Loyola, I. Nadal, "Constitutions of the Jesuit Order" 1558.***

У XVI ст. на абшарах Еўропы пачалі складвацца асобныя адукацыйныя сістэмы. Да жыцця іх выклікалі, як гуманістычныя ідэі эпохі Адраджэння, так і пратэстанцкі рух, а таксама Контррэфармацыя. Ва ўмовах вострага міжканфесійнага супрацьстаяння навучальныя ўстановы сталі адыгрываць куды большае значэнне. У іх сценах канцэнтраваліся найбольш дасведчаныя прыхільнікі той ці іншай рэлігіі, рыхтаваліся навуковыя ды палемічныя творы, адбывалася “змаганне” за падрастаючае пакаленне. Адукацыя ж апошняга ўспрымалася ў непарыўнай сувязі з належным выхаваннем. У выніку, аформіўся так званы “хрысціянскі гуманізм”, згодна якому засваенне старажытных моў, красамоўства, філасофіі ды тэалогіі сумяшчалася з маральнымі нормамі, закладзенымі ў Св. Пісанні.

Найбольш дасканалую на той час педагагічную сістэму здолелі стварыць езуіты – каталіцкі манаскі ордэн, які быў заснаваны ў 1534 г. на хвалі Контррэфармацыі з мэтай умацаваць пахіснуўшыяся пазіцыі каталіцкай царквы. Зрабіць гэта яны планавалі праз адпаведнае выхаванне моладзі. Заснавальнік ордэну іспанец І. Лайёла пісаў, што будучыня належыць тым, хто трымае ў руках маладое пакаленне [1, с. 131]. Першы іх